***У галерэі*** "Універсітэт культуры" адкрылася выстаўка "65 гадоў ААН. Гісторыя і сучаснасць". На ёй прадстаўлены фотаздымкі, якія адлюстроўваюць пэўныя моманты гістарычнага шляху гэтай сусветнай арганізацыі. "Уступная сесія канферэнцыі па стварэнні Арганізацыі бяспекі дзеля міру ў пасляваенным свеце (маёнтак Думбартан-Оўкс у Вашынгтоне)" — ужо адзін гэты здымак дапамагае ўявіць той далёкі час. Уражвае фотаздымак "Праект Адміністрацыйнай дапамогі і аднаўлення ААН (ЮНРА)" з адлюстраваннем сястры міласэрнасці, што раздае харчаванне галодным! "Калектыўны здымак з саміта тысячагоддзя ААН" сабраў кіраўнікоў 149 дзяржаў і ўрадаў 6 верасня 2000 года. Знаёмства з адметнай фотавыстаўкай нагадала яшчэ адну ісціну: і дакумент можа быць мастацтвам.

**Дар'я ШОЦІК**